ПАСПЯХОВЫ — ЗНАЧЫЦЬ ПРЫБЫТКОВЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У прыватнасці, скарацілі таварныя запасы за кошт пераразмеркавання прадукцыі ўнутры гандлёвай сеткі, вяртання пастаўшчыкам тавару, які не меў попыту ў пакупнікоў, арганізацыі выязнога святочнага гандлю, правядзення разнастайных акцый, выставак-продажаў. Філіял Барысаўскага аддзялення «Мінаблсаюздрука» ўпершыню прымаў удзел у Дні беларускага пісьменства ў Быхаве, філіял Слуцкага аддзялення актыўна гандляваў на кірмашы «Слуцкія паясы», філіял Маладзечанскага аддзялення выдатна рэалізоўваў тавар на рэгіянальным кірмашы ў горадзе Маладзечна, філіял Салігорскага аддзялення добра папрацаваў падчас святкавання 50-годдзя горада Салігорска. За гэты кароткі перыяд часу мы забяспечылі рост прадукцыйнасці працы на 157,2% у дзейных цэнах, заработная плата кіяскёраў павялічылася ў паўтара раза, знізілі пратэрмінаваную крэдыторскую і дэбіторскую запазычанасці. Скарацілася колькасць непрацуючых гандлёвых аб'ектаў, у сваю чаргу адкрыты новыя ў гандлёвым цэнтры «Ждановічы» і гарадскім пасёлку Гарадзея Нясвіжскага раёна. Уведзены ў дзеянне кіёскі ў Барысаве, Жодзіне, Маладзечне, Фаніпалі, Сеніцы, аграгарадку Лясны Мінскага раёна, у гарадскім пасёлку Плешчаніцы Лагойскага раёна, якія раней не працавалі.

Рэгулярна сталі праходзіць нарады, дзе разглядаюцца і аналізуюцца пытанні дзейнасці прадпрыемства. Падчас іх людзі выказваюць цікавыя ідэі, думкі, сваё бачанне далейшага развіцця прадпрыемства.

— На прадпрыемстве, наколькі мне вядома, працуюць пераважна жанчыны. З чым гэта звязана?

— Сапраўды, у нашым калектыве налічваецца каля 500 чалавек, 95% з іх — жанчыны. Экспедытары, сартавальнікі, кіяскёры, так бы мовіць, устаюць раней за сонца — а палове чацвёртай раніцы, гандлёвыя кіёскі адкрываюцца ў 6.30, каб людзі своечасова змаглі атрымаць свежую прэсу, інфармацыю пра падзеі ў краіне і за мяжой.

Прадстаўляем суразмоўцу

Сяргей Есін нарадзіўся ў Мінску, закончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі імя Куйбышава (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт), Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. Падпалкоўнік запасу, член Рэспубліканскай грамадскай арганізацыі «Белая Русь». Працаваў на розных адказных пасадах у сістэме дзяржаўнага кіравання нашай краіны, займаецца навуковай дзейнасцю, мае звыш 10 публікацый у навуковых выданнях краіны і за мяжой, аўтар манаграфіі «Дзяржаўны фінансавы кантроль у Рэспубліцы Беларусь». Не спыняецца на дасягнутым, пастаянна ўдасканальвае свае веды. Сяргей Есін узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў, граматамі міністэрстваў інфармацыі, абароны, Акадэміі кіравання, Камітэта дзяржкантролю, мае Падзячнае пісьмо Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, а таксама шмат іншых узнагарод.

Распаўсюджванне перыядычных выданняў — справа спецыфічная. Па-першае, такую вялікую колькасць прадукцыі трэба адсартаваць, раскласці па паліцах. А жанчыны па характары больш цярплівыя, уважлівыя. Толькі яны могуць спраўляцца з такой скрупулёзнай работай. Тым больш што мы гандлюем не толькі перыёдыкай, якая займае палову ва ўдзельнай вазе, але і іншымі таварамі народнага спажывання. Гэта канцылярскія, офісныя прылады, сувеніры, кераміка, ручкі, нататнікі ды шмат чаго іншага.

Хацелася б адзначыць прадаўцоў кіёскаў, што забяспечваюць тавараразварот звыш 100 млн за месяц, зарабляючы каля 4,5 млн рублёў. Гэта ў гандлёвай сетцы філіялаў Барысаўскага (кіёскі №№6, 10, 11, 14 і 18), Салігорскага (кіёскі №№3 і 7), Слуцкага (кіёскі №№1 і 8), Нясвіжскага (кіёск №86), Маладзечанскага (кіёскі №№10 і 15) раёнаў і горада Жодзіна (кіёск №8). Асабліва хачу вылучыць выдатную працу работнікаў Стаўбцоўскага ўчастка рознічнага гандлю, кіёск №55, які рэалізуе прадукцыі на 150 млн рублёў штомесяц.

— Хто можа трапіць у кіяскёры? Ці мае значэнне ўзрост, узровень адукацыі?

— У нас гнуткая сістэма. Прымаем на работу ўсіх ахвотных ад 18 да 70 гадоў. Адна ўмова — ніякіх дрэнных звычак. Тыя, хто не мае базавай адукацыі, праходзяць адпаведныя курсы. Кіяскёр у адной асобе выконвае многія функцыі: і прадаўца, і загадчыка, і дырэктара, і касіра, і кантралёра. Таму патрэбны не толькі высокая адказнасць, але і добрыя веды.

— Апошнім часам у Мінскай вобласці з'явіліся новыя павільёны, якія нагадваюць хутчэй міні-крамы: можна зайсці ў памяшканне, спакойна разгледзець прадукцыю, выбраць усё неабходнае. Вельмі зручна, дарэчы...

— Гэта павільёны з уваходнай групай. Такія аб'екты ўжо ацанілі жыхары Барысава, Жодзіна, Маладзечна. За імі будучыня. Плануем іх устанавіць у першую чаргу на Мінскім участку рознічнага гандлю і ў раённых цэнтрах. Бясспрэчна, замяніць усе традыцыйныя кіёскі на новыя адначасова немагчыма, паколькі кошт аднаго — каля 150 млн рублёў. У наступным годзе 2 такія канструкцыі мяркуецца з дапамогай Мінаблвыканкама ўсталяваць у Заслаўі, дзе будзе праходзіць Дзень беларускага пісьменства.

Наогул мы імкнёмся, каб практычна ў кожным аграгарадку, каля кожнага буйнога прамысловага прадпрыемства, прадпрыемства сацыяльнай сферы, бальніц адкрыць свае кіёскі. У планах — падоўжыць рэжым іх работы. Такія прыклады ўжо ёсць у Стоўбцах, дзе павільён у цэнтры горада працуе да 10 гадзін вечара. І варта сказаць, што прадукцыя вельмі запатрабавана. У сваю чаргу мы імкнёмся стварыць максімальна камфортныя ўмовы для работнікаў.

— «Мінаблсаюздрук» знаходзіцца на гаспадарчым разліку, не фінансуецца з бюджэту. Даводзіцца разлічваць толькі на свае сілы, ці не так?

— Бясспрэчна, для таго, каб рознічная сетка пастаянна развівалася, а прадпрыемства працавала прыбыткова, трэба шукаць новыя крэатыўныя падыходы ў рабоце. І гэта нам удаецца. У перспектыве — далейшае пашырэнне сеткі ў Крупках, Смалявічах, дзе будуецца Кітайска-Беларускі індустрыяльны парк, у Лагойску, Нясвіжскім раёне пры ўваходзе ў замак Радзівілаў, а таксама ўздоўж Мінскай кальцавой дарогі, дзе будуць размешчаны лагістычныя цэнтры. Акрамя таго, у Нясвіжы плануем адкрыць сваю краму, а таксама інтэрнэткавярню ў Слуцку. Цяпер працуем над яе эскізам і каштарысам. Тут будуць прадстаўлены і перыядычныя выданні, кнігі. А таксама адкрываем новыя гандлёвыя аб'екты на Нарачы, у санаторыі «Журавушка», сумесна з канцэрнам «Мінскхлебпрам».

У нашай сістэме не толькі кіёскі, але і дзве стацыянарныя крамы — у Барысаве і Маладзечне, а таксама кавярня «Ля гасцінца» ў Барысаве, якая месціцца на ажыўленай аўтатрасе Мінск — Масква. Вялікую дапамогу ва ўсіх нашых пачынаннях аказваюць мясцовыя выканкамы, якія ахвотна ідуць на супрацоўніцтва.

Вельмі ўдзячны, што людзі паверылі мне, падтрымалі. Іх вопыт, веды, мэтанакіраванасць вельмі спатрэбіліся. І разам мы пераадолелі цяжкасці.

Перш за ўсё ставім перад сабой задачу працаваць эфектыўна і прыбыткова. Шмат у гэтым нам дапамагае кіраўніцтва Міністэрства інфармацыі.

— Сяргей Алегавіч, напэўна, нялёгка даводзіцца ва ўмовах цяперашняй канкурэнцыі? І галоўным канкурэнтам, мяркую, з'яўляецца інтэрнэт.

— У нас шмат канкурэнтаў. Гэта прадпрыемствы дзяржгандлю, спажыўкааперацыі, камерцыйныя структуры, гіпермаркеты, якія рэалізуюць аналагічную прадукцыю. Але мы выжылі ў жорсткіх умовах рынку, стабільна працуем і развіваемся. А што датычыць інтэрнэта, то ён не заменіць газету, часопіс, якія нясуць жывое слова. Пра гэта, дарэчы, сведчыць і наш тавараразварот, які з кожным месяцам павялічваецца. Наш калектыў робіць усё неабходнае, каб перыядычныя выданні былі ў кожным доме, у кожнай сям'і, у кожнага жыхара Мінскай вобласці.

— А вашы дзеці, блізкія аддаюць перавагу камп'ютару ці свежай перыёдыцы?

— У маёй сям'і любяць чытаць. Чытаюць і дзеці, і мае бацькі, якія для мяне з'яўляюцца ідэалам, а іх учынкі — узорам для пераймання. Нядаўна бацька, Алег Паўлавіч, за службу Айчыне і вялікую патрыятычную работу сярод падрастаючага пакалення ўдастоены высокай дзяржаўнай узнагароды — ордэна Айчыны III ступені, які ўручыў яму кіраўнік дзяржавы. Мой бацька — кадравы ваенны, марскі афіцэр, падводнік, капітан I рангу. Сёння ўзначальвае грамадскае аб'яднанне «Беларускі камітэт ветэранаў падраздзяленняў асаблівай рызыкі». Маці, Ларыса Мікалаеўна — педагог, больш за 50 гадоў працуе ў сістэме народнай адукацыі.

— Што б хацелі сказаць калектыву напярэдадні знамянальнай для прадпрыемства даты?

— Па-першае, віншую ўсіх работнікаў, ветэранаў, былых кіраўнікоў прадпрыемства «Мінаблсаюздрук» са святам, зычу моцнага здароўя, сямейнага дабрабыту, цяпла, творчых поспехаў. Многія супрацоўнікі, якія прапрацавалі ў сістэме не адзін дзясятак гадоў, будуць прадстаўлены для ўзнагароджання Ганаровымі граматамі Савета Міністраў, Міністэрства інфармацыі, Мінскага абласнога выканаўчага камітэта і райвыканкамаў. А трое супрацоўнікаў — да ўзнагароджання дзяржаўнымі ўзнагародамі Рэспублікі Беларусь. Дзякую і ўсім нашым спажыўцам, а мы будзем рабіць усё неабходнае, каб яны былі задаволены.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

НАВІНЫ

«АЛІМПІЯДА» ДЛЯ ЮНЫХ СПАРТСМЕНАЎ

Упершыню ў гісторыі дзіцяча-юнацкага спорту нашай краіны беларуская каманда возьме ўдзел у XV Сусветнай гімназіядзе, якая пройдзе з 25 лістапада па 5 снежня ў Бразіліі.

Сусветная гімназіяда ўяўляе сабой комплексныя міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы, у якіх прымаюць удзел школьнікі ва ўзросце ад 14 да 17 гадоў. У праграму ўключаны такія летнія віды спорту, як спартыўная і мастацкая гімнастыка (індывідуальныя і камандныя спаборніцтвы), аэробіка, плаванне, лёгкая атлетыка. У якасці дэманстрацыйных відаў спорту прадстаўлены шахматы, дзюдо і каратэ.

Усяго будзе разыграна 78 камплектаў медалёў. Дэлегацыю Беларусі на спаборніцтвах прадставяць удзельнікі і пераможцы Рэспубліканскай спартакіяды школьнікаў 2013 года ў двух відах спорту — плаванні і лёгкай атлетыцы: плыўцы Мікіта Цмыг (Магілёўскі дзяржаўны ліцэй) і Алена Леаненка (СШ № 11, Віцебск), лёгкаатлеты Павел Селіверстаў (СШ № 48, Мінск), Марыя Жодзік (СШ № 19, Баранавічы), Ганна Тарасюк (гімназія № 16, Мінск) і Святлана Губенка (СШ № 20, Орша).

Арганізуе і праводзіць гэтыя спаборніцтвы Міжнародная федэрацыя школьнага спорту (ISF). У яе ўваходзяць 67 краін свету. Рэспубліканскі цэнтр фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў з 2012 года з'яўляецца паўнамоцным членам ISF і прадстаўляе інтарэсы Міністэрства адукацыі Беларусі. Папярэдняя Сусветная гімназіяда праходзіла ў снежні 2009 года ў горадзе Доха (Катар). У ёй удзельнічалі дэлегацыі з 38 краін, у тым ліку з Кітая, Расіі, Украіны, Латвіі, Эстоніі, Польшчы, Турцыі, Аўстраліі, Бразіліі, Англіі, Італіі, Францыі, Германіі, Венгрыі. Пераможцам у неафіцыйным камандным заліку чатыры гады таму стала каманда школьнікаў з Расіі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯК АД «ЗАМЧЫШЧА» ПРАЕХАЦЬ ДА «ВЯЛІКАГА ЛЕСУ»?

З 1 снежня ў сталіцы пераймянуюць шэраг прыпыначных пунктаў.

Паводле інфармацыі дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс», «Паліклініка», размешчаная па праспекце Машэрава, стане «Тэатральным». «Магазін «Алеся», што па праспекце Пераможцаў, «пераўтворыцца» ў «Замчышча». Прыпыначны пункт «Рагачоўская», размешчаны па вуліцы Герояў 120-й дывізіі і па вуліцы Рагачоўскай (у тым ліку канчатковы прыпыначны пункт аўтобусных маршрутаў №№ 63, 80, 139), пераймянуюць у «Вялікі Лес». «Пасёлак Усходні», што па вуліцы Старынаўскай і праспекце Незалежнасці, стане «Астрашыцкай». Прыпыначны пункт «Мікрараён Уручча-3», размешчаны па вуліцы Нікіфарава, набудзе сугучную ёй назву — «Нікіфарава». «Школа», што знаходзіцца на той жа вуліцы Нікіфарава, стане «Школай № 45», а «Авіяцыйная», размешчаная па вуліцы Рагачоўскай, стане «Рагачоўскай».

ПАДЗЕІ

«ПАНДЭМІЮ» СПЫНІЛІ НА МЯЖЫ

Гаворка не пра эпідэмію планетарнага маштабу, а ўсяго толькі пра настольную гульню з такой назвай. Яна атрымала вялікую колькасць узнагарод па ўсім свеце і карыстаецца попытам.

Магчыма, гэтым кіраваўся адпраўнік грузу з Літвы, калі загружаў тых самых «Пандэмій» больш, чым сам жа заявіў у дакументах? Аднак на мытным пасту «Катлоўка» гэтая неадпаведнасць усплыла, калі падчас мытнага кантролю транспартнага сродку, што накіроўваўся ў Расійскую Федэрацыю, былі знойдзеныя 150 «лішніх» настольных гульняў. Пра гэта паведаміла прэс-служба Ашмянскай мытні. Незадэклараваны тавар на агульную суму 70 мільёнаў рублёў канфіскаваны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПАЙШОЎ НА РЫБАЛКУ І... НЕ ВЯРНУЎСЯ

Як паведаміў старшыня Брэсцкага аблсавета таварыства выратавання на водах Рамуальд САДОЎСКІ, за 10 месяцаў гэтага года на Брэстчыне патанулі 18 рыбакоў. Пры гэтым 9 чалавек загінула пры лоўлі з берага і сем — з лодкі.

Нярэдка трагедыі адбываюцца з-за таго, што людзі ўжываюць спіртное. А вада неабачлівасці не даруе. З 18 загінулых сямёра былі ў нецвярозым стане. Так, рыбак з вёскі Багданы Жабінкаўскага раёна 3 сакавіка нападпітку праваліўся ў палонку. Летам пры лоўлі з берага нецвярозы 40-гадовы жыхар Белаазёрска ўпаў у канал Бярозаўскай ГРЭС і патануў. Гэтай восенню 77-гадовы пенсіянер з вёскі Олтуш выпіў і пайшоў на рыбалку, у возеры Арэхаўскім ён упаў з лодкі і загінуў.

У большасці выпадкаў, пра якія ідзе гаворка, рыбакі не мелі выратавальных камізэлек.

Яна СВЕТАВА.

ФАКТЫ

■ 14 лістапада — Сусветны дзень барацьбы з дыябетам

САЧЫЦЕ ЗА СВАІМ УЗРОЎНЕМ ГЛІКЕМІІ



Цукровы дыябет развіваецца не ад салодкага. Дакладней, не толькі ад салодкага. Тут асаблівае значэнне мае каларыйнасць нашай ежы і, адпаведна, прыбаўка ў вазе. Што да салодзенькага, то як жа наогул без яго? Гэта, што называецца, «гармоны радасці». З іншага боку, рафінаваныя вугляводы — цукеркі, булачкі, пячэнне — ніколі не адносіліся да здаровага харчавання.

Цукровы дыябет — гэта група метабалічных захворванняў (цукровы дыябет 1 тыпу, цукровы дыябет 2 тыпу, іншыя спецыфічныя тыпы, гестацыйны цукровы дыябет), для якіх характэрна гіперглікемія (пастаянна павышаны ўзровень глюкозы ў крыві) як вынік дэфекту выпрацоўкі інсуліну. Хранічная гіперглікемія суправаджаецца пашкоджаннем розных органаў і сістэм. У пацыентаў з цукровым дыябетам павышаецца рызыка развіцця ішэмічнай хваробы сэрца, інфаркту міякарда, артэрыяльнай гіпертэнзіі, хранічнай ныркавай недастатковасці, гангрэны ніжніх канечнасцяў, страты зроку.

ЯК СТАВІЦЦА ДЫЯГНАЗ?

1. У выніку двухразовага значэння ўзроўню глюкозы ў капілярнай крыві раніцай нашча звыш 6,1 ммоль/л (у плазме — звыш 7 ммоль/л).

2. У выніку двухразовага значэння ўзроўню глюкозы ў капілярнай крыві (плазме) на працягу сутак — звыш 11,1 ммоль/л.

3. У спрэчных выпадках мэтазгодна правядзенне пераральнага тэста талерантнасці да глюкозы.

4. Для выяўлення цукровага дыябету 2 тыпу вызначаецца паказчык глікіраванага гемаглабіну, значэнні якога пры двухразовым даследаванні звыш 6,5 працэнта сведчаць аб наяўнасці захворвання.

У нашай краіне адзначаецца рост захваральнасці на цукровы дыябет. Штогод выяўляецца каля 20 тысяч новых выпадкаў. Рэспубліканскі рэгістр змяшчае сёння звесткі пра 240 тысяч пацыентаў. У 93 працэнтаў з іх цукровы дыябет 2 тыпу.

— Выкарыстоўваецца ў нас і сутачнае манітарыраванне, — кажа **галоўны эндакрынолаг Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь Ала ШАПЯЛЬКЕВІЧ**. — Спецыяльны датчык на працягу 72 гадзін і нават шасці дзён фіксуе кожныя 5 хвілін, у тым ліку і ў начны час, узровень глікеміі. Пры гэтым важна пазначаць, якія прадукты ўжываюцца, якой была фізічная актыўнасць. Сучасныя віды інсулінаў і аналагі інсулінаў прызначаюцца на льготнай аснове толькі пасля менавіта такога пацвярджэння глікемічных рэакцый...

Цукровы дыябет 1 тыпу развіваецца пераважна ў дзіцячым і юнацкім узросце. Пры гэтым тыпе дыябету спыняецца выпрацоўка інсуліну — жыццёва важнага гармону, і ў хворага з'яўляюцца выражаная смага, сухасць у роце, пачашчанае мочаспусканне, страта вагі. Адсутнасць неабходнай меддапамогі пагражае дыябетычнай гіперглікемічнай кетаацыдатычнай комай.

Не верце інтэрнэту, які можа прапанаваць тысячу і адзін спосаб лячэння. Лячэнне дыябету 1 тыпу — гэта толькі замяшчальная інсулінатэрапія!

Цукровы дыябет 2 тыпу развіваецца, як правіла, у дарослых, але можа выяўляцца нават у дзяцей. Пры гэтым тыпе ўласны інсулін выпрацоўваецца, але за кошт неадчувальнасці клетак да яго дзеяння фарміруецца павышаны ўзровень глікеміі. Паколькі цукровы дыябет 2 тыпу не мае яркіх сімптомаў, распрацавана методыка скрынінгу. Асноўнымі групамі правядзення скрынінгу ў гэтым выпадку з'яўляюцца:

- ✓мужчыны і жанчыны пасля 45 гадоў;
- ✓пацыенты з метабалічным сіндромам, нарастаннем масы цела (+3-5 кг за апошні месяц);
- ✓жанчыны з атлусценнем і сіндромам полікістозных яечнікаў;
- ✓жанчыны з гестацыйным цукровым дыябетам;
- ✓пацыенты з сасудзістымі катастрофамі (інфаркт міякарда, інсульт).

ДАКАЗАНЫЯ ФАКТАРЫ РЫЗЫКІ РАЗВІЦЦЯ ЦУКРОВАГА ДЫЯБЕТУ 2 ТЫПУ:

— генетычная схільнасць (дыябет у блізкіх сваякоў),

— парушэнні ў харчаванні (недахоп агародніны і садавіны),

— лішняя вага (аб'ём таліі ў мужчын — звыш 94 см, у жанчын — 80 см),

— гіпадынамія (менш за 30 хвілін фізічнай актыўнасці ў дзень),

— хранічны стрэс,

— курэнне, злоўжыванне алкаголем.

Факты сведчаць аб больш высокай распаўсюджанасці парушэння талерантнасці да глюкозы і цукровага дыябету 2 тыпу сярод людзей з атлусценнем, а таксама аб спрыяльным уплыве зніжэння вагі на паказчыкі вугляводнага абмену ў хворых. Рацыянальнае харчаванне і павышэнне фізічнай актыўнасці папярэджваюць цукровы дыябет 2 тыпу ў асоб з высокай рызыкай развіцця захворвання.

Усе пацыенты атрымліваюць лячэнне таблетаванымі цукразніжальнымі прэпаратамі і генна-інжынернымі інсулінамі чалавека. У краіне дзейнічае 227 школ цукровага дыябету, 13 кабінетаў «Дыябетычная ступня».

Святлана БАРЫСЕНКА

Дырэктару ААТ «Спорава» **Аляксандру Эдуардавічу ВЯРЫШКУ**

Шаноўны Аляксандр Эдуардавіч!

Віншую Вас **з 60-годдзем**. Ад сябе асабіста, а таксама ад працоўнага калектыву зычу Вам шчасця, моцнага здароўя і ўтульнасці ў доме, аптымізму ў жыцці і даўгалецця яшчэ на некалькі юбілеяў.

З павагай, Сяргей Сяргеевіч ГЛІНСКІ, дырэктар КУВП «Бярозарайаграсэрвіс».

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Объявляется повторный аукцион на право заключения договора аренды

ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ,

расположенного по адресу: г. Лида, ул. Чапаева, 20, пом. 12 арендуемой площадью 59,9 кв. м сроком на три года.

Повторный аукцион состоится **29 ноября 2013 г. в 11.00** по адресу: **г. Лида, ул. Чапаева, 20, каб. 24Б.**

Начальная цена повторного аукциона **1287850 белорусских рублей.**

Заявление на участие и необходимые документы принимаются **до 17.00 27 ноября 2013 г.** по адресу: **г. Лида, ул. Чапаева, 20, каб. 24А.** Телефоны для справок: **(8 0154) 52 58 55, 52 21 79, факс (8 0154) 52 58 55.**

Организатор повторного аукциона (продавец и арендодатель) — республиканское унитарное предприятие «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» (230019), г. Гродно, ул. Захарова, 27).

Для участия в повторном аукционе участник перечисляет задаток в размере 120000 рублей на расчетный счет Лидского филиала 3012266160011 в отделении № 228 ОАО «Белинвестбанк» г. Лида, код 739, УНП 500173117, ОКПО 03372699.

Оплата стоимости права аренды производится в течение 3 рабочих дней после подписания протокола о результатах повторного аукциона на р/с арендодателя. Договор аренды подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения повторного аукциона и подписания протокола повторного аукциона.

Объявление о проведении аукциона было опубликовано в газете «Звязда» от 24.09.2013 г. № 179 (27544).

Уважаемые акционеры ОАО «Белбакалея»!

27 ноября 2013 года в 14.00 СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Белбакалея»

по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, актовый зал.

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. О реорганизации ОАО «Белбакалея» в форме присоединения к нему ОАО «Белторгстрой».

2. Утверждение цены акций ОАО «Белбакалея», по которой будет осуществляться выкуп акций у акционеров ОАО «Белбакалея».

3. Утверждение договора о присоединении ОАО «Белторгстрой».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Промышленная, 15, АБК, кабинет № 44 с 20 ноября по 26 ноября 2013 года (время работы с 9.00 до 17.00).

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 1 октября 2013 года.

Регистрация участников собрания 27 ноября 2013 года с 9.00 до 13.45 по месту проведения собрания.

Форма проведения собрания — очная.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 100025653 *Наблюдательный совет ОАО «Белбакалея».*

ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ

«ПАДПІШЫСЯ НА «ЗВЯЗДУ»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Падпішыся на «Звязду» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 15 лістапада 2013 года па 31 сакавіка 2014 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» сфарміраваны за кошт маёмасці арганізатара гульні — рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» і складаецца з наступных рэчаў:

№ п/п	Назва	Колькасць (шт.)	Цана за шт. з ПДВ (руб.)	Усяго з ПДВ (руб.)
1.	Мультыварка Scarlet SC-411, Кітай	7	468 000	3 276 000
3.	Тэлевізар Samsung UE22F5000AKXRU, РФ	1	2 849 000	2 849 000

УСЯГО прызавы фонд рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» складае 6 125 000 (шэсць мільёнаў сто дваццаць пяць тысяч) беларускіх рублёў.

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Рэкламная гульня «Падпішыся на «Звязду» праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас установы ў перыяд падпісной кампаніі на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года выразаная з газеты або з укладыша ў газету запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце «Звязда» да двух разоў на тыдзень у перыяд з 15 лістапада 2013 года па 4 студзеня 2014 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ўстанове пасля 11 студзеня 2014 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні ўстанова стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Міхайлічэнка Алена Віктараўна — загадчык аддзела падпіскі і перспектыўных праектаў рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Доўнар Валянціна Аркадзьеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Сянько Аляксандр Анатольевіч — спецыяліст 1 катэгорыі адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Камісія кіруецца ў сваёй дзейнасці рэгламентам (раздзел V гэтых Правілаў).

11. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі гэтай Гульні.

V. РЭГЛАМЕНТ РАБОТЫ КАМІСІІ

12. Камісія ажыццяўляе кантроль за захаваннем правілаў правядзення рэкламнай гульні, вызначае пераможцаў Гульні, якія выйгралі прыз, разглядае скаргі і спрэчныя пытанні, якія ўзнікаюць падчас правядзення Гульні.

13. Пасяджэнні Камісіі вядзе старшыня. Пасяджэнні Камісіі з'яўляюцца правамоцнымі пры наяўнасці большасці членаў з яе зарэгістраванага складу.

14. Члены Камісіі абавязаны: прымаць удзел у пасяджэннях Камісіі, забяспечваць падчас Гульні адпаведнасць парадку яе правядзення гэтым Правілам, вызначаць пераможцаў Гульні, якія выйгралі прызы, прымаць удзел у разглядзе скаргаў (пры іх наяўнасці) удзельнікаў, падпісваць пратаколы пасяджэнняў Камісіі.

15. На пасяджэнне Камісіі ў якасці назіральнікаў без права галасавання могуць запрашацца ўдзельнікі Гульні, прадстаўнікі незалежных арганізацый.

16. Усе рашэнні Камісіяй прымаюцца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў старшыні і членаў Камісіі, якія прысутнічалі на пасяджэнні. У выпадку роўнасці галасоў «за» і «супраць» голас старшыні Камісіі з'яўляецца вырашальным.

17. Рашэнні Камісіі афармляюцца пратаколам, які падпісваецца ўсімі прысутнымі на пасяджэнні членамі Камісіі.

VI. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

18. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 14 студзеня 2014 года ў 12 гадзін у памяшканні ўстановы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

19. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя прасторныя скрыні і старанна перамешваюцца.

20. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываецца па адной мультыварцы.

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца, і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз — тэлевізар.

21. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні або прадстаўнікоў незалежных арганізацый. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

22. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 24 студзеня 2014 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 24 студзеня 2014 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VII. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

23. Умовай выдачы прызоў з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

Пры звароце па атрыманне прыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года.

24. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на першы квартал або першае паўгоддзе 2014 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

25. Прызы выдаюцца пераможцам у тэрмін па 31 сакавіка 2014 года ў памяшканні ўстановы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9:00 да 13:00 і з 14:00 да 17:00, за выключэннем выхадных і святочных дзён. Расходы, звязаныя з прыездам пераможцаў па атрыманне прыза, установа не аплачвае.

26. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

27. Пасля 31 сакавіка 2014 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VIII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

28. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за падачу падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

29. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, фотаздымкі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны ўстановай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты якога-небудзь дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

30. Правілы правядзення рэкламнай гульні «Падпішыся на «Звязду» да пачатку рэкламнай гульні будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

31. Даведкі, якія датычацца гэтай Гульні, можна атрымаць па тэлефоне (017) 287 18 38.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі рэкламнай гульні № 2255 ад 30.10.2013 г., выдадзена Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь.

Шукайце картку ўдзельніка гульні ў бліжэйшых нумарах газеты!